# ПРАВІЛЫ ПАДАЧЫ ЗАЯВАК

EU4Belarus: MOST IV -
Бесперапынны прыём заявак на стажыроўкі
ў краінах ЕС

Фінансуецца Еўрапейскім саюзам

GOETHE INSTITUT Рэалізуецца Гётэ-Інстытутам

*Дата версіі: 25 лістапада 2024*

# Пра праграму MOST IV

Праграма мабільнасці MOST IV садзейнічае прафесійнаму абмену паміж спецыялістамі і спецыялісткамі з Беларусі і Еўрапейскага саюза.

Дзякуючы праграме MOST IV беларусы і беларускі, якія жывуць у Беларусі ці за мяжой, могуць паехаць на стажыроўку ў адну ці некалькі еўрапейскіх краін для павышэння кваліфікацыі, наладжвання прафесійных сувязей і ўстанаўлення партнёрства з еўрапейскімі арганізацыямі.

**Перыяд праграмы**: кастрычнік 2024 – вясна 2027

**Хто можа ўдзельнічаць?**

**1. Грамадзянства**
Заяўнікі і заяўніцы павінны быць мець грамадзянства Рэспублікі Беларусь (пражываць пры гэтым можна як у Беларусі, так і за мяжой)
**2. Узрост**
Старэйшыя за 18 гадоў
**3. Прафесійная сфера**
Заяўнікі і заяўніцы павінны працаваць у адным з шасці сектараў, пералічаных ніжэй
**4. Працягласць стажыроўкі**
Ад 3 да 90 дзён
**5. Краіна прызначэння**
Краіны Еўрапейскага саюза, якія не з'яўляюцца краінай пражывання заяўніка
**6. Тэрмін падачы заяўкі**
За 3 месяцы да пачатку стажыроўкі

**Прафесійныя сектары, якія падтрымлівае праграма MOST IV**

- **Грамадства** (грамадзянская супольнасць, правы чалавека і СМІ)
- **Культура** (культурныя і крэатыўныя індустрыі,турызм )
- **Бізнес** (малы, сярэдні,інавацыйны бізнес, уключаючы IT)
- **Адукацыя** (нефармальная і неакадэмічная)
- **Ахова здароўя** (уключае медыцынскія прафесіі і прафесіі па догляду за хворымі)
- **Устойлівае развіццё** (напрыклад, ахова прыроды і навакольнага асяроддзя, арганічнае сельская гаспадарка, устойлівая энергетыка).

Больш падрабязную інфармацыю аб правілах праграмы і крытэрыях удзелу можна знайсці ніжэй.

# Змест

Пра праграму MOST ... 2

Хто можа падаваць заяўкі? ... 4

Хто не можа падаваць заяўку на праграму? ... 4

Тыпы заявак ... 4

Якія стажыроўкі могуць быць падтрыманы праграмай? ... 5

Калі я магу распачаць стажыроўку? ... 6

У якія краіны я магу паехаць? ... 6

Хто займаецца падрыхтоўкай стажыроўкі? ... 7

Што рабіць, калі ў мяне няма прафесійных кантактаў у ЕС? ... 7

Якія выдаткі пакрывае грант на стажыроўку? ... 7

Якія выдаткі НЕ могуць быць прафінансаваныя за кошт гранта? ... 8

Як разлічваюцца суткавыя? ... 8

Як адбываецца працэс ацэнкі заяўкі? ... 9

Справаздачы ... 10

Абарона асабістых дадзеных ... 10

Падача заяўкі ... 11

Кантакты ... 11

Дадатак 1. Форма заяўкі ... 11

Дадатак 2. Крытэры адбору ... 20

## Хто можа падаваць заяўкі?

- Грамадзяне і грамадзянкі Беларусі
- Асобы, якія дасягнулі ўзросту 18 гадоў
- Рэзідэнты і рэзідэнткі Беларусі ці любой іншай краіны
- Спецыялісты і спецыялісткі аднаго з шасці прафесійных сектараў (бізнес, адукацыя, грамадства, культура, медыцына, устойлівае развіццё)
- Вы можаце прыняць удзел не больш чым у дзвюх стажыроўках па праекце MOST IV (і толькі ў адной стажыроўцы, калі вы раней прымалі ўдзел у папярэдніх этапах праграмы MOST I, MOST II або MOST+)

## Хто не можа падаваць заяўку на праграму?

- Фізічныя асобы, работнікі і работніцы ўстаноў, якія падпадаюць пад санкцыі Еўрапейскага саюза (па рашэнню Савета міністраў замежных спраў ЕС датычна Рэспублікі Беларусь)
- Тыя, хто ўжо падалі заяўку на праграму (паўторна падацца на праграму можна толькі пасля атрымання вынікаў ацэнкі папярэдняй заяўкі)

Праграма MOST IV <u>не падтрымлівае:</u>

- Студэнцкія абмены
- Іншыя актыўнасці падчас стажыроўкі (нельга працаваць дыстанцыйна падчас паездкі, быць стыпендыянтамі іншых праграм і г. д.)
- Паездкі, якія ўжо фінансуецца іншымі праграмамі. Падвойнае фінансаванне адных і тых жа выдаткаў забаронена.

## Тыпы заявак

**1. Індывідуальныя заяўкі**

- Індывідуальныя заяўнікі і заяўніцы нясуць асабістую адказнасць за ўвесь працэс стажыроўкі: падачу заяўкі, камунікацыю з праграмай MOST, рэалізацыю паездкі, падачу наратыўных і фінансавых справаздач.

**2. Групавыя заяўкі**

- Групавая заяўка ўключае некалькі чалавек, якія падаюцца на адну і тую ж паездку для дасягнення агульных або падобных мэт, распрацоўкі агульнага праекта або аб'яднання сваіх навыкаў (напрыклад, музыканты ў аркестры)
- Група можа ўключаць да пяці заяўнікоў
- Усе члены групы павінны быць грамадзянамі Беларусі
- Для ўсёй групы падаецца адна заяўка і бюджэт
- Кожны ўдзельнік або ўдзельніца групы павінны прадставіць рэзюмэ і іншыя запытаныя дакументы
- Прысутнасць кожнага члена групы ў паездцы павінна быць абгрунтавана. Калі стажыроўка аднаго чалавека будзе гэтак жа эфектыўная, як і паездка групы, то такой групе будзе прапанавана выбраць аднаго ўдзельніка або ўдзельніцу, якія маглі б падзяліцца вынікамі паездкі з іншымі пасля вяртання з паездкі.

● У групе павінен быць абраны адзін асноўны прадстаўнік. Яна ці ён будзе ўласнікам уліковага запісу на партале падачы заявак Гётэ-Інстытута і будзе выступаць у якасці асноўнай кантактнай асобы для сувязі з праграмай MOST.
● Асноўны прадстаўнік ці прадстаўніца таксама адказвае за падачу тэкставых і фінансавых справаздач

## Якія стажыроўкі могуць быць падтрыманы праграмай?

### 1. Мэта стажыроўкі

Ваша стажыроўка павінна садзейнічаць прафесійнаму росту і ўстанаўленню партнёрскіх кантактаў з калегамі і калежанкамі ў ЕС. Стажыроўка павінна быць праактыўнай, напрыклад, выступленне на мерапрыемстве, а не толькі яго наведванне. У вашай стажыроўкі могуць быць адна ці некалькі пералічаных мэтаў:

● устанаўленне прафесійных кантактаў;
● распрацоўка сумесных праектаў;
● прасоўванне вашых прадуктаў ці паслуг;
● вывучэнне інавацый вашага сектара і прэзентацыя вашых дасягненняў для больш шырокай аўдыторыі;
● ажыццяўленне азнаямленчай паездкі або паездкі па абмене досведам;
● удзел у трэнінгах;
● праходжанне стажыровак і прафесійных практык;
● іншыя мэты, якія спрыяюць вашай інтэграцыі ў агульнаеўрапейскія прафесійныя супольнасці.

### 2. Працягласць стажыроўкі

Вы можаце падаць заяўку на розныя фарматы стажыровак працягласцю да 90 дзён (уключаючы дні ў дарозе):
● Кароткатэрміновая прафесійная паездка (да 14 дзён);
● Доўгатэрміновая прафесійная паездка (ад 15 да 90 дзён).
● Паездка ў некалькі этапаў дазваляе наведаць да трох розных краін ЕС або здзейсніць тры паездкі на мерапрыемствы за межы краіны пражывання на працягу максімум 1 года.

### 3. Фармат паездкі

● Азнаямленчыя паездкі і візіты па абмене досведам даюць магчымасць абмяняцца прафесійным вопытам і папрацаваць над сумеснымі праектамі з адным ці некалькімі партнёрамі з ЕС.
● Трэнінгі ці стажыроўкі даюць магчымасць развіць асноўныя прафесійныя і дадатковыя "мяккія" навыкі (hard and soft skills).
● Анлайн-стажыроўкі не прадугледжваюць паездкі, але дазваляюць удзельнічаць у анлайн-мерапрыемствах, якія праходзяць або арганізуюцца ў краінах ЕС. Для гэтай катэгорыі стажыроўкі пакрываюцца толькі рэгістрацыйныя ўнёскі.

● Змешаныя ці іншыя фарматы, якія вы можаце сплanaваць, не выходзячы за рамкі правілаў праграмы. Такія стажыроўкі могуць пераследаваць некалькі мэт. У любым выпадку яны не перавышаць ліміт 90 дзён і павінны быць цесна звязаны з вашай прафесійнай дзейнасцю.

## Калі я магу распачаць стажыроўку?

- Прыём заявак адбываецца бесперапынна без прамежкавых дэдлайнаў
- Праграма Most IV дзейнічае з кастрычніка 2024 года да вясны 2027 года
- Ваша паездка можа доўжыцца ад 3 да 90 дзён з улікам дзён ў дарозе
- Заяўка на прафесійную паездку павінна быць пададзена прынамсі за 3 месяцы да меркаванага пачатку гэтай паездкі

*Табліца 1 Працягласць асобных этапаў*

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Падача заяўкі | Не менш за 3 месяцы да запланаванай даты пачатку стажыроўкі |
| 2 | Ацэнка заяўкі | Да 5 тыдняў пасля падачы заяўкі |
| 3 | Падрыхтоўка грантавай дамовы | Да 2 тыдняў (можа спатрэбіцца дадатковы час для афармлення візы; працягласць залежыць ад паўнаты прадстаўленай інфармацыі) |
| 4 | Падпісанне дамовы ўсімі бакамі | Да 1 тыдня (вы можаце пачаць рэалізацыю сваёй стажыроўкі толькі пасля падпісання грантавай дамовы) |
| 5 | Выплата першага траншу | Да 30 дзён пасля падпісання грантавай дамовы |
| 7 | Рэалізацыя стажыровак | Прыблізна да красавіка 2027 года |
| 8 | Фінансавая справаздача і першая тэкставая справаздача | Неабходна прадаставіць цягам двух тыдняў пасля заканчэння стажыроўкі |
| 9 | Выплата другога траншу | Да 30 дзён пасля зацвярджэння фінансавай і першай тэкставай справаздачы |
| 10 | Другая тэкставая справаздача | Неабходна падаць праз 6 месяцаў пасля стажыроўкі |

## У якія краіны я магу паехаць?

Мэтавымі краінамі праграмы MOST з'яўляюцца краіны Еўрапейскага саюза: Аўстрыя, Балгарыя, Бельгія, Венгрыя, Германія, Грэцыя, Данія, Ірландыя, Іспанія, Італія, Кіпр, Латвія, Літва, Люксембург, Мальта, Нідэрланды, Польшча, Партугалія, Румынія, Славакія, Славенія, Фінляндыя, Францыя, Харватыя, Чэхія, Швецыя і Эстонія.

Краіна прызначэння (то бок, краіна, у якой праходзіць стажыроўка) павінна адрозніваецца ад краіны пражывання заяўніка. Прыклад: Вольга жыве ў Варшаве (Польшча), яна не можа паехаць па праграме MOST на стажыроўку ў Кракаў (Польшча). Аднак яна можа абраць у якасці краіны прызначэння любую іншую краіну Еўрапейскага саюза.

# Хто займаецца падрыхтоўкай стажыроўкі?

Вы распрацоўваеце план стажыроўкі самастойна.

• Вы нясеце адказнасць за ўсталяванне прафесійных сувязяў і, калі неабходна, заключэнне неабходных пагадненняў з прымаючым бокам або партнёрамі ў краінах ЕС (да 10 прымаючых арганізацый за адну стажыроўку)

• Вы павінны падрыхтаваць план актыўнасці (план працы па днях) і арганізаваць дэталёвы маршрут паездкі. Пажадана, каб партнёры з ЕС таксама бралі ўдзел у складанні плана стажыроўкі. У плане актыўнасцей павінна быць дадзена дакладнае абгрунтаванне для кожнага дня паездкі.

# Што рабіць, калі ў мяне няма прафесійных кантактаў у ЕС?

Мы можам дапамагчы з ідэямі і прапановамі для вашай стажыроўкі, падказаць кантакты патэнцыйных партнёраў і арганізацый. Каб атрымаць нашу дапамогу, дашліце нам электронны ліст з наступнымі дадзенымі:

1. Матывацыйны ліст. Падайце як мага больш падрабязнай інфармацыі пра сябе, вашы кар'ерныя планы і інтарэсы, прафесійныхя мэты. Напішыце, чаго вы чакаеце ад прафесійнай стажыроўкі ў ЕС.
2. Рэзюмэ. Далучыце да электроннага ліста сваё рэзюмэ  ў адвольнай форме.
3. Дашліце электронны ліст на адрас infomobility@goethe.de. Тэма ліста павінна быць "Matchmaking".

# Якія выдаткі пакрывае грант на стажыроўку?

- Міжнародныя пераезды паміж месцам пражывання і месцам прызначэння (толькі грамадскі транспарт у эканом-класе:аўтобус, цягнік ці самалёт )
- Пераезды ў краіне прызначэння (толькі ў эканом-класе)
- Суткавыя (сума выдаткаў з разліку на адны суткі знаходжання для кожнай краіны ЕС фіксаваная, у яе ўваходзяць выдаткі на пражыванне, харчаванне, мясцовыя паездкі ў межах горада(аў), у тым ліку пераезды ў аэрапорт і з аэрапорта) . Больш падрабязна аб тым, як разлічваюцца суткавыя, чытайце ніжэй
- Рэгістрацыйныя зборы (рэгістрацыйны ўнёскі на  канферэнцыі і іншыя мерапрыемствы) або плата за навучанне (для трэнінгаў)
- Візавы збор
- Выдаткі на дадатковыя паездкі, неабходныя для атрымання візы (павінны быць узгоднены загадзя з MOST IV):
  - у выпадку, калі вы атрымліваеце візу ў Маскве ці Санкт-Пецярбургу;
  - у выпадку, калі вам трэба будзе паехаць з вашага горада ў іншы горад Беларусі, дзе знаходзіцца консульства ці візавы аддзел.
- Медыцынская страхоўка (на перыяд стажыроўкі)
- Асаблівыя патрэбы, звязаныя з інваліднасцю
- Іншыя выдаткі, неабходныяі для дасягнення мэт стажыроўкі. Яны могуць уключаць:

- дадатковы багаж;
- друк улётак або візітовак для прасоўвання свайго прадукту або наладжвання сувязей і г.д;
- дапаможныя матэрыялы (неабходныя для працы расходныя матэрыялы).

**Важна: атрымальнікі гранта нясуць адказнасць за выплату падаткаў, звязаных з атрыманнем гранта**

Грант праграмы MOST IV выплачваецца толькі ў еўра. Бенефіцыяры, якія выкарыстоўваюць банкаўскія рахункі ў іншых валютах, самі пакрываюць дадатковыя выдаткі, якія ўзнікаюць у выніку канвертацыі валют.

## Якія выдаткі НЕ могуць быць прафінансаваны за кошт гранта?

- Выдаткі на індывідуальны транспарт (арэнда аўтамабіля, бензін, паркоўка, дарожныя зборы, страхаванне аўтамабіля, таксі)
- Білеты ў бізнес- або першым класе
- Выдаткі на мясцовы транспарт у горадзе прызначэння, якія пакрываюцца сутказымі (у т.лю гарадскі грамадскі транспарт, трансфер з аэрапорта)
- Выдаткі, не пазначаныя ў бюджэце стажыроўкі, пададзеным разам з заяўкай
- Выдаткі, не звязаныя напрамую з мэтамі стажыроўкі (падарункі, вольны час)
- Выдаткі, пакрытыя іншымі грантамі і праграмамі
- Выдаткі, панесеныя да падпісання грантавай дамовы з праграмай MOST IV
- Выдаткі на стажыроўкі, якія ўжо адбыліся.

## Як разлічваюцца суткавыя?

Суткавыя – гэта фіксаваная стаўка, якая пакрывае выдаткі на перыяд стажыроўкі ў краіне прызначэння. Сюды ўваходзяць выдаткі на жыллё, харчаванне, праезд гарадскім ці прыгарадным транспартам, у тым ліку выдаткі на транспарт у аэрапорт і назад.

- Суткавыя разлічваюцца на аснове колькасці начэй, праведзеных у прафесійнай паездцы за мяжой

- Суткавыя для розных краін ЕС заснаваныя на фіксаваных стаўках, указаных у табліцы ніжэй

- Для працяглых пераездаў ад месца пражывання да месца стажыроўкі праграма MOST IV можа пакрыць адны дадатковыя суткавыя

- Пры неабходнасці перасякаць мяжу Беларусіпраграма можа кампенсаваць адны дадатковыя суткавыя па стаўцы першай краіны ўезду

- Калі жыллё падчас паездкі прадастаўляецца партнёрамі з ЕС ці арганізатарамі мерапрыемстваў і/ці ўваходзіць у рэгістрацыйны ўнёсак, памер суткавых будзе складаць 50% ад указанай стаўкі

● Пры стажыроўцы працягласцю больш за 14 дзён у адной краіне з 15-й ночы суткавыя разлічваюцца наступным чынам: стаўка дзеючых у ЕС суткавых x 0,25 x на колькасць начэй у краіне прызначэння.

**Прыклад 1**

Зміцер адпраўляецца ў 60-дзённую прафесійную паездку ў Балгарыю. Стаўка сутачных ЕС для Балгарыі складае 167 еўра.

Разлік: 167 * 14 (= 2,338) + 167 * 46 * 0,25 (= 1,920,50) = 4,258,50 еўра

**Прыклад 2**

Вольга едзе на стажыроўку ў Францыю (5 сутак) і ў Польшчу (10 сутак), плюс адну ноч яна правядзе ў Вільнюсе (Літва) па дарозе ў першую краіну. Сума яе суткавых разлічваецца наступным чынам: 163 * 1 = 163 еўра на знаходжанне ў Літве плюс 268 * 5 = 1.340 еўра на знаходжанне ў Францыі плюс 170 * 10 = 1.700 еўра за знаходжанне ў Польшчы. Агульная сума суткавых для стажыроўкі Вольгі: 3.203 еўра.

Разлік: 268*5 +170*10+163*1 = 3.203 еўра

*Табліца 2 Стаўкі суткавых у краінах ЕС*

| Краіна ЕС | Суткавыя ў еўра (€) | Краіны ЕС | Суткавыя ў еўра (€) |
|---|---|---|---|
| Аўстрыя | 228 | Мальта | 229 |
| Балгарыя | 167 | Нідэрланды | 236 |
| Бельгія | 239 | Польшча | 170 |
| Венгрыя | 169 | Партугалія | 192 |
| Германія | 216 | Румынія | 171 |
| Грэцыя | 189 | Славакія | 172 |
| Данія | 282 | Славенія | 197 |
| Ірландыя | 247 | Фінляндыя | 259 |
| Іспанія | 205 | Францыя | 268 |
| Італія | 212 | Харватыя | 179 |
| Кіпр | 208 | Чэхія | 177 |
| Латвія | 168 | Швецыя | 275 |
| Літва | 163 | Эстонія | 187 |
| Люксембург | 261 | | |

## Як адбываецца працэс ацэнкі заяўкі?

Заяўкі праходзяць два этапы адбору.
На першым этапе будзе праверана, ці адпавядае заяўка тэхнічным крытэрам:

- адпаведнасць заяўніка і заяўкі фармальным патрабаванням (грамадзянства РБ, непадпаданне пад санкцыі, мэтавая краіна, фармат і працягласць стажыроўкі, апдпаведнасць прафесійным сектарам праграмы)

- ці правільна запоўнена форма заяўкі і ці загружаны ўсе неабходныя дакументы

У выпадку адпаведнасці тэхнічным крытэрам ваша заяўка будзе накіравана прафесійнаму журы, якое складаецца з трох незалежных беларускіх экспертаў і экспертак з вашай прафесійнай сферы. Яны праводзяць ацэнку заяўкі на аснове ўстаноўленых крытэраў адбору (Дадатак 2).

Далей вы атрымаеце электронны ліст з вынікамі разгляду вашай заяўкі на адрас, указаны ва ўліковым запісе на партале падачы заявак.

## Справаздачы

На працягу двух тыдняў пасля завяршэння стажыроўкі  патрабуецца падаць дзве справаздачы: першую тэкставую справаздачу і фінансавую справаздачу разам з пацвярджальнымі дакументамі. Бенефіцыяры атрымліваюць астатак сумы фінансавання (да 20%) толькі пасля ўхвалення гэтых справаздач.

1) Першая тэкставая (апісальная) справаздача падаецца праз партал падачы заявак Goethe Application Portal і складаецца з:

- тэкставага апісання рэалізаваных актыўнасцей і дасягнутых вынікаў падчас стажыроўкі;
- дадаткаў (мінімум трох фотаздымкаў, якія дэманструюць актыўнасці ў рамках стажыроўкі; сканы візітовак новых партнёраў, з якімі ўдалося усталяваць кантакты і да т.п. А таксама па магчымасці: відэа і фота ў сацыяльных сетках).

2) Фінансавая справаздача складаецца з:

- запоўненага шаблону ў Excel з указаннем першапачаткова запланаваных і фактычных выдаткаў;
- падцвярджаючых дакументаў па кожнай катэгорыі выдаткаў:

✔ для фактычных расходаў (напрыклад, рэгістрацыйны ўнесак) – пацвярджэнне расходаў (рахунак-фактура і пацвярджэнне аплаты);

✔ для суткавых – пацвярджэнне таго, што стажыроўка і працягвалася прадугледжаную колькасць дзён (напр., пасадачныя талоны, білеты на транспарт, штампы ў пашпарце, пісьмовае пацверджанне ад прымаючага боку, мясцовыя чэкі, квітанцыі або рахункі-фактуры ў краіне прызначэння на імя грантаатрымальніка).

3) Другая тэкставая (апісальная) справаздача

Праз шэсць месяцаў пасля сканчэння стажыроўкі бенефіцыяры таксама павінны прадаставіць другую тэкставую справаздачу . Гэтая справаздача змяшчае абноўленую інфармацыю аб выніках паездкі, у тым ліку пра ўстойлівасць усталяваных прафесійных кантактаў.

Шаблоны для тэкставых і фінансавых справаздач будуць перададзены разам з грантавай дамовай.

## Абарона асабістых дадзеных

Падаючы заяўку на праграму MOST, вы згаджаецеся на апрацоўку вашых персанальных даных у адпаведнасці з **Правіламі аб абароне персанальнай**

**[інфармацыі Гётэ-Інстытута](#)** і законамі Германіі аб абароне персанальных дадзеных (дэкларацыя аб абароне дадзеных інтэграваная ў электронную форму заяўкі).

## Падача заяўкі

Падаць заяўку на прафесійную паездку можна толькі праз партал падачы заявак Гётэ-Інстытута **[Goethe Application Portal (GAP)](#)**.

Заяўкі прымаюцца на **беларускай**, **рускай** і **англійскай** мовах.

## Кантакты

Накіроўвайце вашы пытанні  па праграме MOST на адрас электроннай пошты: infomobility@goethe.de

## Дадаткі

Дадатак 1. Форма заяўкі
Дадатак 2. Крытэры ацэнкі

## Дадатак 1. Форма заяўкі

# Апісанне конкурса




Праграма мабільнасці MOST IV садзейнічае прафесійнаму абмену паміж спецыялістамі і спецыялісткамі з Беларусі і Еўрапейскага саюза.

Дзякуючы праграме MOST IV беларусы і беларускі, якія жывуць у Беларусі ці за мяжой, могуць паехаць на стажыроўку ў адну ці некалькі краін ЕС для павышэння кваліфікацыі, наладжвання прафесійных сувязей і ўстанаўлення партнёрства.

**Перыяд праграмы**: кастрычнік 2024 – вясна 2027

**Хто можа ўдзельнічаць?**

**1. Грамадзянства.** Заяўнікі і заяўніцы павінны мець грамадзянства Рэспублікі Беларусь (пражываць пры гэтым можна як у Беларусі, так і за мяжой)
**2. Узрост.** Неабходна быць старэйшым за 18 гадоў
**3. Прафесійная сфера.** Заяўнікі і заяўніцы павінны працаваць у адным з шасці сектараў, пералічаных ніжэй
**4. Працягласць стажыроўкі.** Ад 3 да 90 дзён
**5. Краіна прызначэння.** Краіны Еўрапейскага саюза, якія не з'яўляюцца краінай пражывання заяўніка
**6. Тэрмін падачы заяўкі.** За 3 месяцы да пачатку стажыроўкі

**Перыяд праграмы**: кастрычнік 2024 – вясна 2027

Больш падрабязную інфармацыю аб правілах праграмы і крытэрыях удзелу можна знайсці тут.

## Дадзеныя пра стажыроўку

1. **Галіна, у якой вы працуеце ***
    - Культура
    - Бізнэс
    - Адукацыя
    - Ахова здароўя
    - Грамадства
    - Устойлівае развіццё

2. **Колькасць удзельнікаў у заяўцы***
    - 1
    - 2
    - 3
    - 4
    - 5

3. **Мэта вашай стажыроўкі (можна выбраць некалькі варыянтаў)***
    - Усталяваць прафесійныя кантакты
    - Распрацаваць сумесны праект
    - Прэзентаваць сваю працу, паслугі або тавары
    - Дазнацца пра важныя дасягненні ў сваёй галіне
    - Прыняць удзел у візіце па абмене досведам
    - Прайсці навучальны курс
    - Прайсці прафесійную практыку
    - Іншыя мэты, якія падтрымліваюць вашу інтэграцыю ў агульнаеўрапейскія прафесійныя суполкі

4. **Працягласць стажыроўкі***
    - Доўгатэрміновая стажыроўка (ад 15 да 90 дзён)
    - Кароткатэрміновая стажыроўка (да 14 дзён)
    - Паездка ў некалькі этапаў (да трох розных краін ЕС)

5. **Фармат стажыроўкі***
    - Азнаямляльная паездка або візіт па абмене досведам
    - Трэнінг або прафесійная практыка
    - Анлайн-стажыроўка
    - Змешаны ці іншыя фармат

6. **Краіна і даты стажыроўкі***
    - Краіна прызначэння (вы павінны абраць адну з 27 краін ЕС)
    - Пачатак паездкі
    - Канец паездкі

7. **Дадаць краіну прызначэння (вы можаце дадаць адну з 27 краін ЕС)**

## Дадзеныя заяўнікоў

1. **Імя (лацінкай, як у пашпарце)***

   ________________

2. **Прозвішча (лацінкай, як у пашпарце)***

   ________________

3. **Нумар тэлефона (з кодам краіны)**

   ________________

4. **Электронны адрас***

   ________________

5. **Краіна, у якой вы жывяце на дадзены момант***

   ________________

6. **Горад/Вобласць**

   ________________

7. **Адрас (вуліца і нумар дому)***

   ________________

8. **Індэкс***

   ________________

9. **Ваш узрост***
   - 18-25
   - 26-35
   - 36-45
   - 46-55
   - > 55

10. **Гендерная ідэнтычнасць***
    - Мужчына
    - Жанчына
    - Небінарная асоба
    - Не хачу пазначаць

11. **Ці падвяргаліся вы дыскрымінацы або несправядліваму абыходжанню? Ці падвяргаліся вы палітычным рэпрэсіям?***

- Так
- Не

**Калі так, распавядзіце падрабязней**

___________________

12. **Ці ўдзельнічалі вы ў мабільнасцях MOST раней, у тым ліку ў папярэдніх этапах MOST 2015-2020 гадоў або MOST+ 2022-2024 гадоў?***
    - Так
    - Не

    **Калі так, распавядзіце падрабязней**

    ___________________

13. **Укажыце інфармацыю пра вашу пасаду і месца працы**
    (Калі магчыма, пакіньце спасылку на сайт вашай арганізацыі)

    ___________________

14. **Пазначце тып вашай занятасці***
    - Беспрацоўная(-ы)
    - Самазанятая(-ы) або ІП
    - Занятая(-ы) ў прыватным сектары
    - Занятая(-ы) ў дзяржаўным сектары
    - Занятая(-ы) ў НДА
    - Пенсіянер(-ка)

15. **Апішыце значнасць паездкі для вашай прафесійнай дзейнасці і кар'еры**

    ___________________

16. **Калі ласка, пакіньце спасылкі на вашыя сацыяльныя сеткі ці іншыя рэсурсы, якія могуць дапамагчы нам верыфікаваць вас.***

    ___________________

17. **Пазначце ваш узровень валодання мовамі краін, куды вы накіроўваецеся, або як вы плануеце камунікаваць з прымаючым бокам.***

    ___________________

18. **Вам трэба атрымаць візу, каб патрапіць у краіну прызначэння?***
    - Yes
    - No

**19. Загрузіце тут сваё рэзюмэ (дакумент у адвольным фармаце на адну/дзве старонкі з кароткай інфармацыяй пра вас, вашу адукацыю і прафесійны досвед)**

**20. Як вы даведаліся пра MOST IV?***

- Шукаў(-ла) у інтэрнэце магчымасці стажыровак
- Са старонкі MOST у Facebook
- Са старонкі MOST у Instagram
- З канала MOST у Telegram
- З канала MOST на YouTube
- Я ўжо ўдзельнічала(-аў) у праграме MOST
- Праграму MOST мне параілі знаёмыя
- Я даведалася(-аўся) пра праграму з сайта Гётэ-Інстытута
- Я наведала(-аў) мерапрыемства, арганізаванае MOST
- Мне парэкамндавалі праграму MOST калегі
- Я наведала(-аў) мерапрыемства, дзе пачуў (убачыў, атрымаў флаер) пра MOST
- Я ўбачыла(-ыў) публікацыю пра праграму MOST на іншым сайце/медыя платформе/акаўнце сацсетак

**21. Тут вы можаце дадаць да 4 іншых удзельнікаў групы ў якасці сузаяўнікоў.**

## Дадзеныя аб мерапрыемстве ці прымаючай арганізацыі

**Мерапрыемства і прымаючая арганізацыя**

**1. Укажыце мерапрыемства/прымаючы бок***

_________________

**2. Спасылка на сайт арганізацыі/мерапрыемства***

_________________

**3. Імя і кантактныя дадзеныя вашай кантактнай асобы ў прымаючай арганізацыі***

_________________

**4. Загрузіць запрашэнне**

Пакіньце тут запрашэнне ад прымаючай арганізацыі або ліст-пацверджанне. Гэта можа быць або афіцыйны эмэйл, або падпісаны запрашальны ліст, які павінен уключаць: кароткае апісанне арганізацыі або мерапрыемства, імя заяўніка (і кожнага ўдзельніка групы, калі гэта групавая заяўка), кароткае апісанне супрацоўніцтва з заяўнікам, працягласць стажыроўкі.

5. **Дадаць прымаючую арганізацыю**

## Бюджэт стажыроўкі

1. **Загрузіце запоўненую форму бюджэту (у фармаце .xls або .xlsx)***
   Запоўніце форму бюджэта для вашай стажыроўкі, выкарыстоўваючы нашы шаблоны для групавых ці індывідуальных заявак

2. **Пазначце тут яшчэ раз агульную суму вашай стажыроўкі**
   Разлічаная ў форме бюджэта сума ў еўра

## Матывацыя і мэты

1. **Апішыце тут мэты і чаканыя вынікі вашай стажыроўкі***
   Не больш за 2000 сімвалаў

   _________________

2. **Апішыце, чаму вы выбралі менавіта гэтую прымаючую арганізацыю або мерапрыемства***
   Не больш за 1000 сімвалаў

   _________________

3. **Калі ласка, растлумачце, як паездка дапаможа вам дасягнуць названых мэт. Таксама растлумачце, чаму ваша паездка павінна доўжыцца менавіта такі перыяд часу для дасягнення вышэйназваных вынікаў?***
   Неабходнасць паездкі для дасягнення мэт
   Не больш за 2000 сімвалаў

   _________________

4. **Якія крокі вы ўжо зрабілі для арганізацыі стажыроўкі? Распішыце тут падзённы план.***
   Падрыхтоўка і падзённы план мерапрыемстваў
   Не больш за 2000 сімвалаў

   _________________

5. **Якія доўгатэрміновыя эфекты прынясе гэтая паездка? Растлумачце, як вы плануеце іх дасягаць***
   Плануемыя доўгатэрміновыя эфекты і план іх дасягнення
   Не больш за 1000 сімвалаў

   _________________

6. **Ці плануеце вы падзяліцца досведам, атрыманым падчас паездкі, з вашай прафесійнай супольнасцю?**
   План перадачы досведу
   Не больше за 1000 сімвалаў

## Самадэкларацыя

- ✓ Я разумею, што я буду мець права на атрыманне гранта на стажыроўку толькі ў выпадку, калі я выканаю ўсе ўмовы, указаныя ў Кіраўніцтве па падачы заяўкі.
- ✓ Я пацвярджаю, што я не не атрымліваў (-ла) ніякага іншага фінансавання для рэалізацыі праекту, які з'яўляецца прадметам гэтай заяўкі.
- ✓ У выпадку падачы некалькіх заявак у розныя донарскія арганізацыі, я абавязваюся неадкладна паведаміць аб любым іншым фінансаванні, якое я атрымаю для рэалізацыі праекту, што з'яўляецца прадметам гэтай заяўкі.
- ✓ Я пацвярджаю, што я падрыхтаваў(-ла) гэтую заяўку без удзелу супрацоўнікаў, адказных за працэс адбору заявак.
- ✓ Я заяўляю, што ў цяперашні час я не працую ў Гётэ-Інстытуце, інстытутах Еўрапейскага Саюза і ніводны з членаў маёй сям'і не ўдзельнічае у адборы заявак.
- ✓ Мне невядома пра існаванне фактычнага, патэнцыйнага ці меркаванага канфлікту інтарэсаў*.
  *Канфлікт інтарэсаў узнікае, калі пад пагрозу ставіцца бесстаронняе і аб'ектыўнае выкананне функцый любой асобы, задзейнічанай у рэалізацыі праграмы.
- ✓ Калі мяне абяруць у якасці атрымальніка гранта, я абавязваюся неадкладна апавяшчаць супрацоўнікаў праекта аб любых зменах, якія тычацца маёй заяўкі і ўдзелу ў праграме.
- ✓ Я пацвярджаю, што Еўрасаюз не ўводзіў супраць мяне ніякіх абмежавальных мераў.
- ✓ Я заяўляю, што я раней не быў(-ла) выключаны(-а) з праектаў, якія фінансуюцца Еўрасаюзам, і не падвяргаўся(-лася) фінансавым санкцыям з боку Еўрасаюза.
- ✓ Я заяўляю, што прачытаў(-ла) і зразумеў(-а) Правілы ўдзелу ў праекце MOST IV.
- ✓ Я заяўляю, што я добрасумленна запоўніў(-ла) форму заяўкі, і, наколькі мне вядома, уся інфармацыя, указаная ў маёй заяўцы, дакладная.
- ✓ Для групавых заявак: я пацвярджаю, што дадзеная самадэкларацыя распаўсюджваецца на кожнага ўдзельніка маёй групы.

# Дэкларацыя пра ахову дадзеных

- ✓ Я згодзен/згодна з палітыкай канфідэнцыйнасці.
- ✓ Я пацвярджаю, што ўся прадастаўленая мною інфармацыя дакладная. Я ўсведамляю, што прадастаўленне няправільнай інфармацыя можа прывесці да адхілення заяўкі або да скасавання кантракта.

# Захаваць і адправіць

1. **Фінальныя заўвагі**

   ___________________

# Дадатак 2. Крытэры ацэнкі

**Крытэры і шкала ацэнкі**
**EU4Belarus: MOST IV - Бесперапынны прыём заявак на прафесійныя паездкі**

**Шкала балаў**

- 5 – Выдатна (абсалютна пераканаўчае і лагічнае апісанне, ніякіх відавочных недахопаў не выяўлена)
- 4 – Вельмі добра (апісанне пераканаўчае і паслядоўнае, з мінімальнымі недахопамі)
- 3 – Добра (апісанне пераканаўчае, нягледзячы на дробныя хібы. Апісанне паслядоўнае, але з відавочнымі недахопамі)
- 2 – Недастаткова (апісанне пераканаўчае толькі ў некаторай ступені; месцамі непаслядоўны, а хібы настолькі вялікія, што адказ не адпавядае патрабаванням, мноства недахопаў)
- 1 – Нездавальняюча (адказ пераканаўчы толькі ў вельмі абмежаванай ступені, ён толькі зрэдку паслядоўны, поўны хібаў, або наогул адсутнічае ці дадзены не цалкам)

| Асноўныя крытэры ацэнкі | | Балы |
|---|---|---|
| Прафесійная значнасць паездкі *макс. 25 балаў* | Асабістая і прафесійная матывацыя заяўніка.ці заяўніцы | Ад 1 да 5 |
| | Наколькі пераканаўча распісана мэта запланаванай паездкі? | Ад 1 да 5 |
| | Ці мае паездка рэальную вартасць для прафесійнага росту заяўніка ці заяўніцы? | Ад 1 да 5 |
| | Ці ёсць прамая сувязь паміж паездкай і сферай прафесійнай дзейнасці заяўніка? | Ад 1 да 5 |
| | Ці адпавядае прапанаваная паездка прафесійнай дзейнасці заяўніка з улікам дадзеных, пазначаных у яго (яе) рэзюмэ. | Ад 1 да 5 |
| Мэтазгоднасць і рэалістычнасць паездкі *макс. 25 балаў* | Наколькі добра апісаны прапанаваны праект стажыроўкі? Наколькі лёгка можна зразумець ключавыя аспекты паездкі? | Ад 1 да 5 |
| | Ці адпавядаюць краіна прызначэння і прымаючы бок/партнёр(ы) заяўленым мэтам стажыроўкі? Наколькі яны рэлевантныя ў кантэксце дадзенай паездкі? | Ад 1 да 5 |
| | Ці добра спланаваны і арганізаваны мерапрыемствы ў межах паездкі? Ці прадастаўлена штодзённая праграма актыўнасцяў: абгрунтавана неабходнасць кожнага дня гэтай праграмы. | Ад 1 да 5 |

| | | |
|---|---|---|
| | Ці з'яўляецца прапанаваны бюджэт дакладнымі рэалістычным? Ці адпавядаюць запланаваныя выдаткі актыўнасцям у межах стажыроўкі ? | Ад 1 да 5 |
| | Ці зможа заяўнік эфектыўна камунікаваць з прымаючай арганізацыяй/партнёрамі? Ці існуе магчымасць пераадолець патэнцыйныя моўныя бар'еры? | Ад 1 да 5 |
| Эфект ад паездкі для супольнасці<br>*макс. 15 балаў* | Ці дасць гэта паездка дададтковы эфект беларускім калегам/прафесійнай супольнасці заяўніка? | Ад 1 да 5 |
| | Ці апісаў заяўнік(-ца), як ён (яна) плануе дзяліцца вынікамі стажыроўкі з іншымі беларускімі спецыялістамі? Ці ёсць апісанне плана па абмене вынікамі і атрыманым досведам з паездкі | Ад 1 да 5 |
| | Ці паўплывае гэтая стажыроўка станоўчым чынам на развіцце адпаведнага прафесійнага сектара ў Беларусі? | Ад 1 да 5 |
| Устойлівасць<br>*макс. 5 балаў* | Ці мае заяўнік план далейшых актыўнасцяў? | Ад 1 да 5 |
| Адпаведнасць мэтам / каштоўнасцям праграмы MOST<br>*макс. 5 балаў* | Наколькі прапанаваная мабільнасць адпавядае агульным мэтам праграмы MOST (садзейнічанне ўстанаўленню прафесійных кантактаў паміж грамадзянамі Беларусі і краін ЕС)? | Ад 1 да 5 |
| Дадатковыя крытэры адбору | | |
| Геаграфія<br>*макс. 5 балаў* | Ці пражывае заяўнік у Беларусі? | +5 балаў |
| Паездкі ў менш запатрабаваныя краіны<br>*макс. 2 балы* | Ці ўваходзіць выбраная заяўнікам краіна прызначэння ў наступны спіс: Аўстрыя, Балгарыя, Харватыя, Кіпр, Фінляндыя, Грэцыя, Венгрыя, Ірландыя, Латвія, Люксембург, Мальта, Румынія, Славакія, Славенія ці Швецыя? | +2 балы |
| Удзел у папярэдніх праграмах MOST<br>*макс. 3 балы* | Ці удзельнічаў(-ла) заяўнік(-ца) у мінулых праграмах MOST I/II, MOST+ або MOST IV? | +3 балы (калі ўдзельнічае ўпершыню) |
| Адсутнасць роўных умоваў<br>*макс. 5 балаў* | Ці падвяргаўся(-лася) заяўнік(-ца) рэпрэсіям, дыскрымінацыі або несправядліваму абыходжанню? | +5 балаў |
| У выніку (макс. 90 балаў) | | |